Булацкая Н.А.,
дацэнт

## СПЕЦКУРС І КУРС ПА ВЫБАРУ Ў СІСТЭМЕ ГУМАНІТАРНАЙ АДУКАЦЫІ: ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА

Інтэграцыя Беларусі ў сусветнае супольніцтва робіць асабліва актуальнай праблему адпаведнасці нашай сістэмы адукацыі агульнапрызнаным сусветным падыходам ў гэтай галіне.

У свеце не існуе ідэальнай сістэмы адукацыі, і кожная з сістэм, як частка культуры, абапіраецца ў першую чаргу на свае гістарычныя і культурныя традыцыі. З улікам, аднак, палітычных і эканамічных рэалій. Патрэбна прааналізаваць станоўчае і адмоўнае і прыглядзецца да вопыту іншых краін.

У англійскіх універсітэтах існуюць дзве сістэмы адукацыі. Аснову першай складаюць лекцыі, а ц'ютарскія заняткі, семінары і групавыя заняткі выконваюць дапаможныя функцыі. Ядро другой - ц'ютарскія заняткі, а лекцыі і семінары выступаюць у якасці дапаможных формаў навучання.

У Італіі 19-20 вучэбных курсаў як мінімум, з якіх не менш 5 з'яўляюцца абавязковымі, а астатнія ці факультатыўнымі, ці па выбару.

У Швецыі каля 1/3 дысцыплін вучэбнага плана - абавязковыя, амаль палову вывучаемых дысцыплін складаюць курсы па выбару (якія студэнт выбірае з цыклаў у 3-10 прадметаў), а астатнія - факультатыўныя. Кожны прадмет вывучаецца не больш аднаго семестра.

У Японіі 1/3 - абавязковыя дысцыпліны, астатнія - па выбару.

У нашым універсітэце пачала адбывацца падобная тэндэнцыя. Здавалася б, усё проста: агульны лекцыйны курс - абавязковы, агульнаадукацыйны; спецкурс - паглыбляючы, канкрэтызуючы асновы; курс па выбару - аднасеместравы, параўнальна кароткі курс - дысцыпліна. Аднак узнікае шэраг праблем. Вызначым некаторыя з іх.

Вопыт работы заходнееўрапейскіх і амерыканскіх універсітэтаў паказвае: колькасць курсаў па выбару малая на малодшых курсах, а на старшых складае 2/3 ад абавязковых дысцыплін. У нас таксама прызнана мэтазгодным выкладаць спецкурсы і курсы па выбару для студэнтаў-старшакурснікаў.

Аб аб'ёме спецкурса і выбарачнага курса. Розныя кафедры ставяцца да гэтага па-рознаму. Кафедра філасофіі прапануе спецкурсы ў межах 6-12 гадзін, кафедра беларускай мовы і літаратуры - 18-30, а кафедра лінгвістыкі і беларусазнаўства тактычна ўвогуле не вызначае аб'ём. Гэта звязана, мажліва, не толькі з нявызначанай нормай вучэбных гадзін на спецкурс, але і з тым, што раней амаль усе гадзіны прыпадалі на спецкурсы па спецдысцыплінах. Зараз становішча патроху выпраўляецца.

Курс па выбару студэнт павінен выбраць самастойна. Неабходна памятаць, што важнейшай умовай рэалізацыі палажэння аб выбарачных курсах з'яўляецца разуменне адукацыі як права, а не абавязку. Ініцыятарам выбару выступае студэнт. Што ж будзе ў яго выбары галоўным: зацікаўленасць тэмай, выкладчыкам (патрабавальны - непатрабавальны, асоба - пасрэднасць, цікавы - не) ці жаданне «праскочыць» хутчэй?

Асаблівай увагі патрабуе тэматыка спецкурсаў і курсаў па выбару. Яна павінна арыентавацца на павышэнне якасці ведаў, агульнай культуры студэнта, быць арыентаванай на будучую спецыяльнасць. Каб не было некарысных спецкурсаў, неабходна ўзгадняць тэмы між кафедрамі, пашыраць між імі сувязі.

Варапаева В.С.,
прафесар

## ЛІТАРАТУРНАЯ АДУКАЦЫЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

Праблема літаратурнай адукацыі даволі складаная і ўключае шэраг аспектаў. У прыватнасці, гэта і літаратурная дасведчанасць, і ўменне кваліфікавана выбіраць і самастойна чытаць кнігі, і, безумоўна, разуменне спецыфікі мастацтва, і літаратурны густ.

Пачынаецца літаратурная адукацыя ў дзяцінстве, калі немаўлятка, не ўмеючы яшчэ чытаць, слухае пацешкі, забаўлянкі, жарты, песні, казкі, сэрцам адгукваючыся на іх. Працягваецца яна ў пачатковай, сярэдняй школе, а затым у студэнцкай аўдыторыі. Менавіта на ўроках чытання закладваецца фундамент літаратурнай адукацыі, і ад таго, які ён будзе, залежыць выхаванне «таленавітага чытача».

Доўгі час да ўрока чытання ўтрымліваўся утылітарны падыход. Аб гэтым сведчыць нават сам тэрмін «тлумачальнае чытанне». Да твораў, з якімі знаёміліся дзеці, падыходзілі як да матэрыялу, які распавядаў школьнікам пра нейкія падзеі і з'явы. Забывалася галоўнае: дзіцячая літаратура - мастацтва, пра якое трэба гаварыць мовай мастацтва. Таму мы лічым: у пачатковай школе павінна быць «літаратурнае чытанне». Сэнс яго - навучыць дзяцей успрымаць і разумець літаратуру як мастацтва слова (навучанне чытанню здзяйсняецца на злінні эмацыянальных і разумовых працэсаў у адзіную інтэлектуальную духоўную дзейнасць).

Зместам літаратурнага чытання павінны стаць лепшыя ўзоры сусветнай дзіцячай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ